# І. ДАМЕЙКА: МІНЕРОЛАГ І КАРТОГРАФ

**М. С. Стрэльчанка**
*Гомельскі дзяржаўны тэхнічны універсітэт імя П. В. Сухога, Беларусь*
Навуковы кіраўнік Ю. В. Юрыс, канд. тэхн. навук, дац.

Вучоны-даследчык, геолаг, мінеролаг. Нарадзіўся ў маёнтку Мядзвядка Навагрудскага павета Мінскай губерніі. З 1812 г. вучыўся ў манастырскай школе ў Шчучыне. У 1816 г. паступіў на фізіка-матэматычны факультэт Віленскага універсітэта, дзе поруч з прыродазнаўствам вывучаў гісторыю, літаратуру, слухаў лекціі вядомых прафессараў І. Лялевеля, Я. Снядэцкага і інш. Ва універсітэце разам з А. Міцкевічам і Я. Чачотам прымаў удзел у тайным таварыстве філаматаў. Ён стаў правобразам героя Жэгота з паэмы А. Міцкевіча «Дзяды». У 1822 Дамейка атрымаў ступень магістра філасофіі, а ў 1823 г. разам з іншымі ўдзельнікамі студэнцкіх нелегальных гурткоў арыштаваны і высланы з Вільні пад нагляд паліцыі ў Дзятлаўскі раён. Яму было забаронена паступаць на дзяржаўную службу і займацца грамадскай дзейнасцю. Дамейка прыняў актыўны удзел у паўстанні 1830–1831 гг. у Польшчы і на Беларусі, змагаўся ў складзе арміі Д. Хлапоўскага. Пасля паражэння паўстання ён вымушаны быў эмігрыраваць.

У Парыжы Дамейка стаў вучыцца ў вышэйшай школе горнай справы Сарбонскага універсітэта. Пасля яе заканчэння Дамейка займаўся даследваннямі. У 1837 г. ён склаў геалагічную, гідраграфічную і гаспадарчую карты былой Рэчы Паспалітай. У 1850 г. у Парыжы ім надрукаваны лепшы на той час геаграфічны атлас Польшчы, аднак І. Дамейка не пазначыў сваё аўтарства.

Усё ж найбольшую вядомасць яму прынесла дзейнасць не ва Францыі, а ў іншай краіне. У снежні 1837 г. ён прыняў прапанову чылійскага ўрада і падпісаў кантракт на пасаду выкладчыка горнай школы ў г. Какімба на поўначы Чылі. Пачатак яго навуковай дзейнасці быў нялёгкім. У 1989 г. да 100-годдзя з дня смерці вучонага газета «Эль Меркурыо» змясціла на сваіх старонках фрагменты з дзённіка І. Дамейкі, у якім ён расказаў пра свае першыя крокі на чылійскай зямлі [1, с. 90]. Яшчэ ў Парыжы, у час падрыхтоўкі да паездкі, І. Дамейка марыў заснаваць у Чылі добрую хімічную лабараторыю для аналізаў і розных даследаванняў. І таму ён прывёз з сабою ў Какімба ўсё неабходнае лабараторнае абсталяванне. Чылійцы дзівіліся, назіраючы, як выгружалі з карабля і адпраўлялі ў школу 30 вялізных скрыняў, прызначаных для стварэння новага класа мінералогіі. Дамейка чытаў лекцыі, займаўся з вучнямі, а ў 1840 г. накіраваўся з геалагічнай экспедыцыяй у горы, дзе адкрыў паклады невядомага навуцы альгамату серабра, які атрымаў назву аркерыт. Ён арганізаваў для моладзі курсы па вывучэнні фізікі і хіміі, заснаваў фізічную лабалаторыю, навуковую бібліятэку, стварыў заалагічную калекцыю.

Яго вучань Ніколас Наранью знайшоў багатую срэбраносную жылу, якую назваў імем свайго настаўніка – «Міна дэ Дамейка». У 1845 г. Дамейка наведаў паўднёвую ўскраіну Чылі, дзе пазнаёміўся з побытам і звычаямі мясцовых жыхароў, сабраў багаты фальклорны матэрыял. Па выніках падарожжа ён напісаў і апублікаваў на іспанскай мове кнігу «Араўканія і яе жыхары». Нягледзячы на абвінавачванні ў несправядлівых адносінах да абарыгенаў, кніга прыйшлася да спадобы чылійцам, была перакладзена на многія іншыя мовы.

Пасля заканчэння кантракта Міністэрства адукацыі Чылі прапанавала Ігнату прыняць удзел у распрацоўцы і правядзенні рэформы адукацыйнай сістэмы краіны. У 1843 г. ён напісаў працу, якая была прынята ў якасці праекта рэформы ўсёй сістэмы народнай і універсітэцкай адукацыі. Адданасць І. Дамейкі навуцы ў гэтай

краіне не ведала сабе роўных. Не выпадкова адна з чылійскіх газет назвала яго «апосталам навукі». У сваіх вучняў наш зямляк імкнуўся выхоўваць высокія памкненні і мэты. «Юнак павінен адчуваць любоў да вучобы, каб развіваць свае разумовыя здольнасці. Калі з дзяцінства абуджаць у пяшчотным сэрцы і яркім уяўленні матэрыяльную выгаду і эгаізм, вельмі хутка яго талент будзе згублены і згасне» [1, с. 91].

У 1847 г. ён атрымаў ва універсітэце кафедру хіміі, займаўся навуковай і выкладчыцкай дзейнасцю. Пасля Сусветнай выстаўкі ў Парыжы ў 1867 г., дзе Дамейка прадстаўляў малую прамысловасць Чылі, яго выбралі рэктарам універсітэта. Перыядычна (чатыры разы) на гэтай пасадзе ён быў у 1867–1883 гг. Заслугі «Дона Ігнацío» (так з павагай называлі яго у Чылі) перад новай радзімай нельга пераацаніць. У адчыненай паводле яго праекта Горнай школе былі падрыхтаваны першыя нацыянальныя кадры выкладчыкаў, геолагаў, мінеролагаў. У сталіцы Чылі Дамейка арганізаваў службу метэаралогіі, стварыў і рэалізаваў праект новага водаправода. Упершыню ў Лацінскай Амерыцы ён увёў у Чылі метрычную сістэму мер і вагі. Для даследавання прыродных багаццяў Чылі і пошукаў новых крыніц сыравіны ён арганізаваў навуковыя экспедыцыі ў пустыню Атакама і ў горы, вывучаў вулканы, неаднойчы перасякаў Анды і Кардыльеры. З гэтай жа мэтай ён пабываў у Бразіліі, Уругваі, Перу, Аргенціне і іншыя і ўзбагаціў навуку звесткамі пра новыя расліны і мінералы ў гэтых краінах, шматлікія лекавыя крыніцы. З імем Дамейкі звязана распрацоўка навуковай асновы эксплуатацыіпрыродных багаццяў. У выніку даследаванняў ён прапанаваў здабываць прамысловым спосабам некаторыя мінералы. Сам займаўся будаўніцтвам шахтаў і капальняў, здаў у эксплатацыю некалькі капальняў па здабычы медзі, серабра, золата. Яго нават выбіралі вярхоўным суддзёй па горных спрэчках. На Чылійскім узбярэжжы Ціхага акіяна Дамейка знайшоў значныя паклады салетры і прапанаваў выкарыстоўваць яе на ўгнаенне глебы. Ён першы распачаў картаграфанне і раянаванне геаграфічных і геалагічных з'яў, у сваіх навуковых працах закранаў праблемы межаў геаграфічных арэалаў.

Дамейка распрацаваў арыгінальную на той час канцэпцыі прадукцыйнасці геаграфічнага асяроддзя. Выдадзены ў Чылі падручнік «Мінералогія» на працягу некалькіх дзесяцігоддзяў выкарыстоўваўся ў многіх лацінаамерыканскіх краінах. 130 навуковых прац прынеслі яму сусветную вядомасць і славу. Сведчаннем гэтага з'яўлялася выбранне Дамейкі ганаровым членам шматлікіх навуковых таварыстваў. Яго навуковыя паведамленні абмяркоўваліся на пасяджэннях Парыжскай акадэміі навук, публікаваліся ў навуковых часопісах Еўропы. Дамейка назаўсёды парадніўся з Чылі, быў жанаты з чылійкай, але ніколі не забываў сваю далекую радзіму. Толькі амаль у канцы жыцця яму было дазволена наведаць радзіму. У 1884 г. Дамейка разам с сынамі прыязджаў у родныя мясціны. Памер Дамейка ў 1889 г. Ён быў абвешчаны народным героем Чылі. У гонар яго быў выпушчаны памятны медаль, прызначана самая высокая ў краіне пенсія. Яго імем названы адзін з партовых горадаў (Пуэрта-Дамейка), вулканічны ланцуг гор у Андах, а таксама адкрыты ім мінерал (дамейкіт) і фіялкавая кветка (віёла дамейкона). У яго доме быў створаны музей, а ў Сант'ягі пастаўлены помнік «Грандэ Эдукатору» («Вялікаму асветніку»).

Ушаноўваюць памяць І. Дамейкі і на радзіме. У Мядзвядцы ўстаноўлены памятны знак дзеля ўшанавання нашага славутага земляка, а ў мясцовай школе адкрыты музей, экспанаты якога расказваюць пра жыццё і навуковую дзейнасць І. Дамейкі.

Літаратура

1. Кошур, С. І. Дамейка. Новыя матэрыялы з карэліцкага краязнаўчага музея «Зямля і людзі» / С. І. Кошур // Культура гродзенскага рэгіену: праблемы развіцця ва ўмовах поліэтнічнага сумежжа: сб. навук. прац. – Гродна : ГрДУ, 2003.